| Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь | Министерство культуры Республики Беларусь |
| --- | --- |
| Установа адукацыі «БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ» (БДАМ) | Учреждение образования «БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ» (БГАИ) |
| ЗАГАД | ПРИКАЗ |
| 26.01.2024 № 16 | |
| г. Мінск | г. Минск |

Аб арганізацыі размеркавання выпускнікоў БДАМ у 2024 годзе

У адпаведнасці з кодэксам Рэспублікі Беларусь ад 13 студзеня 2011 г. № 243-З “Кодекс Республики Беларусь об образовании”, “Положением о порядке распределения, направления на работу, перенаправления на работу, предоставления места работы выпускникам, получившим научно-ориентированное, высшее, среднее специальное или профессионально-техническое образование”, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 жніўня 2022 г. № 572 (далей – Палажэнне) і ў мэтах размеркавання і накіравання на працу выпускнікоў 2024 года
ЗАГАДВАЮ:

1. Стварыць камісію па размеркаванні выпускнікоў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” ў 2024 годзе ў наступным складзе:

РОТМІРАВА А.А. – першы прарэктар, старшыня камісіі:

СІЛЬВАНОВІЧ А.І. – загадчык кафедры кіно і тэлебачання, намеснік старшыні камісіі:

Члены камісіі:

ВАСІЛЬЕЎ В.І. – наместнік дэкана па выхаваўчай рабоце факультэта экранных мастацтваў;

КІСЯЛЁВА С.Г. – начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю, старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў;

ЛАЎРЭЦКІ Г.А. – дэкан мастацкага факультэта;

МІШЧАНЧУК У.А. – прафесар кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры;

НЯДВЕЦКАЯ А.Л. – начальнік аддзела кадраў;

САВАСЦІНКЕВІЧ І.В. – начальнік вучэбна-метадычнага аддзела;

ШАСТАК А.Л. – вядучы юрысконсульт;

ШЫМЕЛЕВІЧ Г.Г. – дэкан факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

ШЭМЕТ В.С. – дыспетчар мастацкага факультэта, сакратар камісіі (пры размеркаванні выпускнікоў мастацкага факультэта);

ГАРКОЎСКАЯ Л.М. – вядучы спецыяліст факультэта экранных мастацтваў, сакратар камісcii (пры размеркаванні выпускнікоў факультэта экранных мастацтваў);

НАЗАРАВА Л.А. – вядучы спецыяліст факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сакратар камісii (пры размеркаванні выпускнікоў факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва);

ШАЛУХІНА Н.Р. – лабарант 1 кв. катэгорыі кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры, сакатар камісii (пры размеркаванні выпускнікоў для тэатральнага факультэта);

КАНДРАТОВІЧ Т.М. – метадыст 1 кв. катэгорыі вучэбна-метадычнага аддзела, сакратар (пры размеркаванні выпускнікоў магістратуры).

2. Пасяджэнні камісіі па размеркаванні выпускнікоў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” правесці ў аўдыторыі № 205 вучэбнага корпуса № 1 у адпаведнасці з графікам работы камісіі па размеркаванні выпускнікоў (дадатак).

3. Дэканам факультэтаў, загадчыкам выпускаючых кафедр правесці работу:

з упраўленнямі культуры, прадпрыемствамі і ўстановамі па забеспячэнню паступлення пісьмовых запытаў аб размеркаванні да іх на працу выпускнікоў;

з выпускнікамі па арганізацыі самастойнага пошука першага месца працаўладкавання.

4. Дэканам факультэтаў у тэрмін да 19.02.2024 падрыхтаваць і прадставіць у папяровым і электронным выглядзе старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А.:

спісы выпускнікоў, якія падлягаюць размеркаванню (па напрамках спецыяльнасці (спецыялізацыях));

спісы выпускнікоў, якія маюць ільготы пры размеркаванні з копіямі дакументаў аб ільгоце;

спісы выпускнікоў бюджэтнай формы навучання, якія маюць права на самастойнае працаўладкаванне;

Старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А. на падставе асабовых спраў абагульніць пададзеныя спісы, забяспечыць захаванне ў асабовых справах выпускнікоў 2024 года дакументаў, якія падцвярджаюць ільготы пры размеркаванні.

5. Дэканам факультэтаў у тэрмін да 15.03.2024 падрыхтаваць і прадставіць у папяровым і электронным выглядзе начальніку вучэбна-метадычнага аддела САВАСЦІНКЕВІЧ І.В. спісы выпускнікоў, якія ўключаны ў банк дадзеных адоранай моладзі і ў банк дадзеных таленавітай моладзі.

6. Сакратарам пасяджэнняў камісіі па размеркаванні выпускнікоў да 15.03.2024 на падставе заключаных з базавымі арганізацыямі дамоў, пададзеных заявак ад арганізацый-заказчыкаў кадраў на падрыхтоўку спецыялістаў, пісьмовых запытаў ад іншых арганізацый, падрыхтаваць і прадаставіць (у папяровым і электронным выглядзе) старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А. планы размеркавання выпускнікоў

(дадатак 3 Палажэння). Азнаёміць з імі студэнтаў выпускных курсаў і магістрантаў.

7. Дэканатам факультэтаў сумесна з вядучым юрысконсультам ШАСТАК А.Л. ў тэрмін да 18.03.2024 азнаёміць студэнтаў выпускных курсаў з наступнымі дакументамі:

7.1 "Кодекс Республики Беларусь об образовании" ад 13 студзеня 2011 г. № 243-З (артыкулы 72-79 главы 8).

7.2 "Положение о порядке распределения, направления на работу, перенаправления на работу, предоставления места работы выпускникам, получившим научно-ориентированное, высшее, среднее специальное или профессионально-техническое образование", зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 жніўня 2022 г. № 572.

7.3 "Положение о порядке возмещения в республиканский и (или) местные бюджеты средств, затраченных государством на подготовку научного работника высшей квалификации, специалиста, рабочего, служащего", зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 жніўня 2022 г. № 572.

8. Старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А. падрыхтаваць дакументацыю для размеркавання выпускнікоў установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"(тэрмін выканання – да 10.04.2024).

9. Сакратарам пасяджэнняў камісіі па размеркаванні выпускнікоў забяспечыць падрыхтоўку і прадастаўленне старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А. да 26.04.2024 у папяровым і электронным выглядзе:

пратаколаў пасяджэнняў камісіі па размеркаванні выпускнікоў;

ведамасцей размеркавання выпускнікоў 2024 года (дадатак 4 Палажэння).

9. Старшаму інспектару аддзела кадраў ЗЕЛЯНОЎСКАЙ С.А. падрыхтаваць і забяспечыць прадастаўленне ва ўстаноўленыя тэрміны справаздач аб размеркаванні на працу і працаўладкаванні выпускнікоў 2024 года згодна зацверджаным формам у Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і іншыя дзяржаўныя арганізацыі.

10. Начальніку аддзела кадраў НЯДВЕЦКАЙ А.Л. кантраляваць:

прадастаўленне ва ўстаноўленыя тэрміны справаздач аб размеркаванні на працу і працаўладкаванні выпускнікоў 2024 года ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і іншыя дзяржаўныя арганізацыі.

11. Начальніку вучэбна-метадычнага аддзела САВАСЦІНКЕВІЧ І.В. кантраляваць прадастаўленне да 01.04.2024 у дзяржаўныя органы спісаў выпускнікоў, якія ўключаны ў банк дадзеных адоранай моладзі і ў банк дадзеных таленавітай моладзі.

12. Зацвердзіць графік работы камісіі па размеркаванні выпускнікоў установы адукацыіі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў".

13. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага прарэктара РОТМІРАВУ А.А.

Рэктар М.Р.Баразна

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад рэктара
установы адукацыіі
“Беларуская дзяржаўная
акадэмія мастацтваў”
26.04.2024 № 16

# Графік
работы камісіі па размеркаванні выпускнікоў
установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”
2024 год

| Факультэт | Адказныя выканаўцы | Даты пасяджэнняў |
|---|---|---|
| Факультэт экранных мастацтваў | Васільеў В.І.<br>Гаркоўская Л.М. | 23.04.2024<br>10.00 |
| Тэатральны факультэт | Мішчанчук А.У.<br>Шалухіна Н.Р. | 23.04.2024<br>11.00 |
| Мастацкі факультэт | Лаўрэцкі Г.А.<br>Шэмет В.С. | 24.04.2024<br>10.00 |
| Факультэт дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | Шымелевіч А.Г.<br>Назарава Л.А. | 24.04.2024<br>11.00 |
| Магістратура | Сільвановіч А.І.<br>Кандратовіч Т.М. | 24.04.2024<br>14.30 |